# На сваёй зямлі, альбо Там, дзе вырастаюць крылы натхнення

Любоў — паняцце шматграннае і неабдымнае — бывае рознай: бацькоўскай і сыноўскай, паміж мужчынам і жанчынай, да прафесіі, радзімы... Колькі людзей, жыццёвых сітуацый – столькі адценняў гэтага незвычайнага пачуцця, якое (і толькі яно) напаўняе наша жыццё сэнсам. Але любоў да радзімы, сваёй зямлі — катэгорыя асаблівая, вечная. І хоць кожны чалавек выказвое яе па-свойму — хтосьці творамі маствцтва, а нехта карыснымі справамі—яднаюць нас шчырасць і одкрытасць памкненняў, з якімі мы гаворым пра месца, адкуль пайшлі родам.

Не толькі тэхнічная дасканаласць выканання, а менавіта шчырасць і непадробнасць аўтарскай задумы — вось адны з галоўных параметраў, ла якіх ацэньваюцца работы на Міжнародным конкурсе дзіцячага малюнка "На сваёй зямлі" што праводзіцца ў Беларусі 3 2006 года.

"25 тысяч работ з 27 краін свету — такое багацце назапашана за тры гады, — гаворыць Марыя Маркевіч, прэс-сакратар грамадскага аб'яднання "Беларускі зялены крыж" — А сёлета за дыпломы І, ІІ і ІІІ ступеняў спаборнічалі звыш 12 тысяч малюнкаў. Прыгажосць сваей зямлі, акрамя юных беларусаў, апявалі школьнікі і студэнгы з Расіі і Казахстана, Латвіі і Польшчы, Балгарыі і Германіі, Індыі і Турцыі, Кітая і Сербіі...” І хоць кампетэнтнае журы (з педагогаў, мастакоў і знаўцаў жывапісу з розных краін свету) падвяло вынікі яшчэ ў лютым, заслужаныя ўзнагароды крыху пачакаюць пераможцаў: апошнія атрымаюць іх у маі, калі ў Мінску адкрыецца Міжнародная экспазіцыя дзіцячага малюнка.



Як жыць на сваёй зямлі? Адказ на філасофскае пытанне арганізатары конкурсу (акрамя згаданага "Зялёнага крыжа" гэта Міністэрствы адукацыі, культуры, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя) прапануюць знайсці, выбраўшы адну з пяці зададзеных тэм. "Жылі-былі", "Поры года. Пейзаж" "Гарадская мелодыя" "Далёкія вандроўкі" (па матывах твораў Гамера), "Дарагі мой чалавек" — магчымасцей, каб праявіць талент і фантазію, дастаткова. Але, як і ў папярэднія гады, найбольшай папулярнасцю карыстаецца пейзажны жанр. На мой погляд, тлумачэнне таму даволі простае: перш-наперш свая зямля — гэта прырода, якая дорыць творцу адчуванне гармоніі з навакольным светам. Менавіта такой гармоніяй і дасканаласцю прасякнуты малюнкі правінцыяльных, натхнёных малой радзімай жывапісцаў. Яны бачаць не шэрую аднастайнасць каменных "джунгляў" а маляўнічую непаўторнасць родных краявідаў. Нездарма навучэнцы мастацкіх школ і студый са Слуцка і Ляхавіч, Смалявіч і Гродна, Сянно і пасёлка Энергетыкаў (Дзяржынскі раён) — заўсёды ў ліку пераможцаў. А сярод удзельнікаў з іншых краін — адметныя малюнкі школьнікаў з расійскага Омска (хіба пакіне абыякавым велічная і загадкавая Сібір) і башкірскага Сцерлітамака. Конкурс дазваляе праявіць свае мастацкія здольнасці як маленькім (ад 3 да 6 гадоў), так і больш дарослым удзельнікам, узростякіх пазначаны наступнымі катэгорыямі: ад 7 да 9, ад 10 да 11, ад 12 да 13 і ад 14 да 16 гадоў. Самымжа ”сталым” творцэм — ад 17 да 21 года.



Нехта адразу ведае, пра што хоча сказаць у малюнку, хтосьці задумваецца і праводзіць у пошуку не адзін дзень — умовы конкурсу лаяльныя да першых і другіх, бо тэмы новага творчага спаборніцтва аб'яўляюцца яшчэ тады, калі падводзяцца вынікі папярэдняга. І работам, дасланым у Мінск з 1 кастрычніка па 31 снежня, наканаваны сапраўды незвычайны лёс. Канечне, самыя шчаслівыя з іх становяцца пераможцамі — упрыгожваюць выставачныя залы, радуюць людзей. Але радасць гэта не абмяжоўваецца пэўнымі тэрмінамі і датамі: выстава, адбыўшыся ў Мінску, пасля падарожнічае, і не толькі па сваёй зямлі, а і далёка за яе межамі. "Малюнкі, якія мы атрымліваем, — не "мёртвы капітал" —

усміхаюцца супрацоўнікі грамадскага аб'яднання "Беларускі зялёны крыж" — Іх жыцце заўсёды працягваецца і пасля конкурсу" Так летась дзіцячая творчасць па вартасці была ацэнена (дзе б вы думалі!) у Дзяржаўнай думе Расійскай Федэрацыі. Менавіта на сценах калідораў гэтай сур'ёзнай, такой далёкай ад мастацтва ўстановы віселі дзіцячыя работы. І палітыкі, заклапочаныя слуханнямі аб законапраектах і палемікай з апанентамі, пад час перапынку не раз і не два спыняліся каля малюнкаў, каб хоць позіркам дакрануцца да непасрэднасці і чысціні твораў юных аўтараў. А яшчэ каля 70 работ трапілі ў Крым: дырэктар адной з мясцовых школ настолькі быў імі ўражаны, што шчыра захацеў, каб такое ж захапленне перажылі і яго выхаванцы.

Конкурс "На сваёй зямлі" вызначаецца дабрачыннай скіраванасцю. Работы-ўдзельнікі, не адзначаныя дыпломамі, упрыгожваюць калідоры школ і дзіцячых бальніц. А ў Беларускім рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай анкалогіі і гематалогіі пастаянна дзейнічае экспазіцыя са 150 малюнкаў. Як тут не паверыць у тое, што сапраўднае мастацтва лечыць.

Так атрымалася, што сёлета конкурс надзвычай актуальны: калі, як не ў Год роднай зямлі, апяваць яе прыгажосць і веліч,



прызнавацца ў любові малой радзіме — месцу, якое, па словах пісьменніка, адорвае нас крыламі натхнення. І зусім няважна, стаўты пераможцам утворчым спаборніцтве ці не. Галоўнае, каб гэтыя крылы (не кожнаму яны даюцца) узнімалі цябе да нязведаных вяршынь, адкрывалі новыя гарызонты. І каб вобраз бацькаўшчыны жыў не толькі на малюнку, а перш за ўсе ў душы і сэрцы.

***Ірына ДРАБЫШЭЎСКАЯ***

**Источник:** Родная прырода.-2009.-№4.-С.20-21.